# Цытаты,роля цытат у выказванні, афармленне іх на пісьме (11 клас)

**І. А. Ганчарова,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
СШ № 32 г. Магілёва
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі

*Рабінечаканае, рабі, як не бывае,*
*рабі, як не робіць ніхто – і тады*
*пераможаш.*

Уладзімір Караткевіч

Урок – гэта даволі складаны , але цікавы працэс. Гэта таямніца , якую стварае настаўнік разам вучнямі. А зрабіць гэты працэс насычаным, захапляльным, цікавым і карысным даволі цяжкая задача. Новы стандарт адукацыі, які прад'яўляе новыя патрабаванні да вынікаў навучання, дае магчымасці па-новаму паглядзець на ўрок, ажыццяўляць новыя творчыя ідэі. Выкарыстанне розных прыёмаў, метадаў і форм дапамагаюць зрабіць кожны ўрок разнастайным і непаўторным . Прапаную вашай увазе ўрок камбінаванай будовы ў 11 профільным класе **"Канструкцыі з чужой мовай (цытаты,роля цытат у выказванні, афармленне іх на пісьме)"**, у якім спалучаюцца розныя педагагічныя тэхналогіі метады і прыёмы "сітуацыя яркай плямы", "прэзентацыя", "кластар", " зарадка" , "тэст", "міні-сачыненне", "слова-імпульс", "рознаўзроўневыя заданні".

**Мэта:** Садзейнічаць засваенню сэнсу, які ўкладваецца ў слова "цытата", растлумачыць ролю цытаты ў выказванні,фарміраваць уменне дарэчна падбіраць і ўключаць цытаты ў сваё маўленне,пунктуацыйна правільна афармляць іх на пісьме, развіваць уменне публічна выказвацца, ужываць у мове цытаты,выхоўваць павагу да Бацькаўшчыны, да роднага слова.

**Абсталяванне**: Карта Беларусі, лірычная музыка, сцікеры ў выглядзе сэрцаў,карткі з заданнямі, праверачны тэст,выстава кніг беларускіх пісьменнікаў, чые творы будуць гучаць на ўроку, партрэты гэтых аўтараў, прэзентацыя "Цытаты, роля цытат у выказванні,афармленне іх на пісьме".

**Ход урока**

**I.** Арганізацыйны момант

1. Гучыць музыка і загадзя падрыхтаваныя вучні з месца пачынаюць выразна чытаць на памяць урыўкі з твораў бел. пісьменнікаў:

"Спадчына" Я.Купала- 1 слупок
"Родныя вобразы" Я.Коласа-1 слупок
"Не шукай" Я.Купала- 1 слупок
З прадмовы да кнігі "Юдзіф" Ф.скарына – таму што звяры…

2. **Настаўнік:**

- Рабяты, а ці вядомы вам творы ,урыўкі з якіх зараз прагучалі? Назавіце іх.

- ❖ Але ж зараз не ўрок беларускай літаратуры, а ўрок беларускай мовы.Як вы думаеце, навошта тады гучалі гэтыя творы? ( Каб прыгожа пачаць урок,   Каб успомніць творы, якія вывучалі на ўроках  літаратуры. Я заўважыла, што ўсе гэтыя творы на адну тэму , у іх гаворыцца пра Радзіму. А можа, наш урок будзе звязаны з выказваннямі  беларускіх пісьменнікаў)
- Сапраўды, рабяты, наш сённяшні ўрок будзе прысвечаны вось такім прыгожым выказванням, інакш кажучы, цытатам
- Дата----     Класная работа-------  Тэма
- ❖ А як вы думаеце, ці спатрэбяцца вам веды па гэтай тэме ў жыцці? (Да, таму што цытаты робяць мову больш прыгожай, насычанай. Выкарыстанне цытат паказвае на культурны ўзровень чалавека. Спатрэбіцца пры далейшай вучобе – напісанне сачыненняў, розных прац у інстытуце, тэхнікуме)

3. Вучні фармулюць мэту ўрока.  ***(прыём "сітуацыя яркай плямы")***

**Мэта нашага ўрока:**

- Навучыцца дарэчна падбіраць цытаты і ўключаць іх у сваё маўленне
- Правільна афармляць іх на пісьме
- Выхоўваць у сябе павагу і любоў да Радзімы, роднай мовы

## II. Праверка арфаграфічнай граматнасці вучняў

Зараз з мэтай  выпрацоўкі арфаграфічных навыкаў і ўменняў мы напішам з вамі слоўнікавы дыктант:

Нарэшце, раз-пораз, таксама,якраз, паціху, па- таварыску,калісьці, дзе- небудзь, па пояс, дзясятка, васямнаццаты,пяцьдзясят, семдзесят,абедзве, дзвесце, медаль, легенда, герой, камп'ютар,інтэрнэт,шынель,абы- як, абы з кім, на памяць, вінчэстар, мядзведзь, каменьчык, чамаданчык, не спяшаючыся, здароўе.(Ажыццявіць самаправерку, ключ падаецца)

- ❖ Рабяты, яшчэ раз звярніце ўвагу на тыя словы,у якіх вы зрабілі памылкі. Дома выпішыце іх у свой слоўнік і запомніце правапіс.

## III. Тлумачэнне новага матэрыялу

**1.** А вось цяпер пераходзім непасрэдна да нашай тэмы ўрока. Адкрыйце,калі ласка, падручнікі на стар.218, прачытайце правіла, падкрэсліце ключавыя словы. Зрабіце вывад: цытата – гэта…

**2.** Перад вамі на парце карткі з цытатамі. Давайце прачытаем іх і выведзем правіла афармлення цытат на пісьме:

- І. Мележ пісаў:"Той, хто не паважае родную мову, не паважае роднага народа"

А:"Ц".          **( Як простая мова)**

- Віталь Вітка неаднаразова напамінаў,што" з усіх сродкаў выхавання, якія ёсцьу нас, людзей,самым выпрабанавым і надзейным было і будзе слова".

[     ], ( што"ц").          **(Як складаназалежны сказ)**

- У вершы "Родныя вобразы" Я.Колас шчыра выказвае любоў да сваёй Радзімы:

Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая!
Што маё сэрца да вас парывае?
Чым так прыкованы я

А:          **( Не бярэцца ў " ")**

Верш.цытата

- Як казаў Ф.Багушэвіч, “не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі”

Як п.с., “ц”. **(Пабочны сказ і цытата)**




3. Вучні фармулююць правіла, складаюць схему ў сшытку **(*прыём “кластар”)***

**IV.** **<u>Фізкультхвілінка</u>** (Успамінаем геаграфію, рукамі малюем абрысы Беларусі. Сэрцам нашай краіны з’уляецца Мінск (рукі на сэрца), на поўначы размяшчаецца Віцебск ( цягнемся да яго), на поўдні – Брэст і Гомель (нахіляемся ўніз),на захадзе – Гродна (нахіляемся ўбок), на ўсходзе Магілёў (нахіляемся ў другі бок ). Мы, беларусы, шчыры і гасцінны народ. Сябруем на поўначы з Літвой і Латвіяй ( памашам ім рукамі), на поўдні – з Украінай( нізкі паклон нашым сябрам), на захадзе павітаем жыхароў Польшчы (пацiснем руку суседу злева), на ўсходзе размяшчаецца наша сястра – Расія ( пацiснем руку суседу справа) і апладысментамі павітаем саміх сябе – жыхароў горада Магілёва). ***(прыём зарадка)***

**V.** <u>Замацаванне новага матэрыялу</u>

1. А зараз замацуем тэарэтычныя веды на практыцы. Задача: запісаць сказ на дошцы, расставіць знакі прыпынку. Звярнуць увагу на правапіс асобных слоў.

- Народная *<u>мудрасцьсцвярджае</u>*: “Чалавек *<u>без</u>* Радзімы,як салавей без песні”.
- У вершы “ Не шукай” Я. Купала зрабіў *<u>своеасаблівы</u>* заклік:

*<u>Не шукай</u>* ты шчасця, долі

На чужым, далёкім полі

- М. Танк, гаворачы пра паэзію Я.Купалы, падкрэсліваў, што “гэта *<u>квітнеючы</u>* і чароўны сад, дзе сабраны водар *<u>беларускай</u>* зямлі”.
- Як гаворыць *<u>прыказка</u>*, “толькі таму пашана *<u>будзе</u>*, хто Радзіму не на словах любіць”.
- <u>Творчае заданне</u>. Мэта наступнага задання навучыцца падбіраць цытаты і ўжываць іх у вусным маўленні. ***(прыём “міні–сачыненне”)***

Кожная група (3 рады- 3 групы)рыхтуе невялікі тэкст( 5-6 сказаў) на пэўныя тэмы, уводзячы ў яго цытаты:

Мой родны кут, як ты мне мілы,
Забыць цябе не маю сілы”.

“Новая зямля”. Якуб Колас

Дзе мой край? Там, дзе вечную песню пяе Белавежа, “Беларуская песня”.
Там, дзе Нёман на захадзе помніць варожую кроў, У. Караткевіч
Дзе на ўзвышшах Наваградскіх дрэмлюць суровыя вежы
І вішнёвыя хаты глядзяцца ў шырокі Дняпро.

Родная мова, цудоўнаямова! “Родная мова”. Уладзімір Дубоўка
Ты нашыхдумак уток і аснова!
Матчындарунак ад самайкалыскі,
Ты самацветаўяскраваянізка.

Кажуць, мова мая аджывае “Родная мова”. Пімен Панчанка
Век свой ціхі: ёй знікнуць пара.
Для мяне яна вечна жывая,
Як раса, як сляза, як зара.

“Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі”. Ф. Багушэвіч

Дзе нарадзіўся, там і згадзіўся. Прыказка

Можна выкарыстаць тыя, што ўжо гучалі на ўроку
1 група- Прырода Беларусі
2 група- Мая Радзіма Беларусь
3 група – Родная мова

❖ Некалькі вучняў чытаюць свае тэксты

1. Беларусь – мая краіна, мая любоў, маё жыццё… Маю Радзіму здаўна называюць сінявокай, чароўнай і зялёнай прыгажуняй. І гэта , безумоўна, так, бо столькі казачных мясцін, прыгожых рэк і азёр, лясоў і лугоў не сустрэнеш нідзе! Як можна не любавацца зялёнымі лясамі, напоўненымі сонечнымі зайчыкамі, якія прабіваюцца праз густую зеляніну дрэў. Заходзіш – і ты быццам у зачараваным царстве. Жыццё ідзе, бурліць, кіпіць… І нельга не пагадзіцца са словамі Я.Коласа:

Мой родны кут, як ты мне мілы!Забыцьцябе не маю сілы!

2. Беларусь… Як шмат значыць гэта слова для нас – яе дзяцей. Гэта і родныя з дзяцінства краявіды, і працавітыя, сціплыя людзі, і мілагучная беларуская мова, і мама, і клёкат буслоў… І нельга імкнуцца ў іншыя месцы адтуль, дзе ўсё так сэрцу міла, люба і знаёма! Бо , як кажа народная мудрасць, “ дзе нарадзіўся, там і згадзіўся”.

3. Ф. Багушэвіч пісаў: “Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі”. Я поўнасцю згодна з гэтым выказваннем, бо мова – гэта вопратка народа. Без мовы народ голы, бездапаможны, слабы. Мова выхоўвае людзей, фарміруе нацыю, надзяляе народ мудрасцю, годнасцю. Жыве мова – жыве народ! Шануйце, беражыце, паважайце беларускую мову! Шануйце і паважайце сябе, беларусы!

## VI. Выніковы кантроль

• З мэтай праверкі ведаў па тэме вучні працуюць над тэстам. (***прыём “тэст”)***

**Тэст**

1.Адзначце правільнае сцвярджэнне:

Цытата – гэта…

А) чужая мова, перададзеная ад імя аўтара са змяненнем граматычных прымет непасрэдна сказанага;

Б) даслоўная вытрымка з выказвання або твора, прыведзеная аўтарам для пацвярджэння ці тлумачэння сваёй думкі.

2.Адзначце сказы, у якіх цытата ўведзена ў аўтарскую мову як частка сказа:

А) Якуб Колас пісаў:” Паэзія Я. Купалы – гэта квітнеючы і чароўны сад, дзе сабраны водар беларускай зямлі”

Б) Якуб Колас вельмі вялікае значэнне надаваў роднаму слову. Ён называў яго “ першай крыніцай, праз якую мы пазнаём жыццё і акаляючы свет”.

В) У нас любяць цытаваць радкі Я.Коласа” Мой родны кут, як ты мне мілы!”

3.Адзначце сказ з цытатай:

А) А дзядзька Ігнат сказаў: “ Не разумею я тых людзей, якія адракаюцца ад Радзімы!”

Б)” Глядзі дзяцей і маці, сынок,” – сказаў Ігнат Дзянісавіч, пацалаваўшы Петруся.

В) “ Падзел мовы на літаратурную і народную, – пісаў М. Горкі, – азначае толькі тое, што мы маем, так сказаць “ сырую” мову і апрацаваную майстрамі.”

4. Цытаты афармляюцца:

А) Як простая мова

Б) Як просты сказ

В) Як складаназалежны сказ

5. Цытаты заўсёды бяруцца ў двукоссе:

А) Да, абавязкова

Б) Не, вершаваныя цытаты ў двукоссе не бяруцца.

Ключ:1.Б); 2.Б); 3.В); 4.А) В); 5.Б);

## VII. Падвядзенне вынікаў. Выстаўленне адзнак.

- Д/З :стар.190–правіла, практ.219. Па жаданні – творчае заданне: праект або прэзентацыя на тэму : “Цытаты , іх роля ў маўленні”. ***(прыём “рознаўзроўневыя заданні”)***

## VIII. **Рэфлексія**

Перад Вамі карта Беларусі, на парце ў кожнага сцікер у выглядзе сэрца. Напішыце 1 сказ пра Беларусь, мову і падарыце сваё сэрца Радзіме.( Вучні выходзяць,чытаюць сказ і клеяць сэрца на карту).

***(прыём “слова – імпульс”)***

Прыкладныя адказы:

- Я ганаруся тым, што жыву ў Беларусі
- Мой родны кут, як ты мне мілы
- Я люблю сваю Радзіму
- Дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся
- Няма лепшай вадзіцы, як з роднай крыніцы
- Радзіму, як маці, не выбіраюць
- Не шукай ты шчасця, долі на чужым, далёкім полі і г.д.

## Літаратура


1. **Дьяченко, В. К.** Сотрудничество и обучение / В. К. Дьяченко. – М., 1991. – 184 с.
2. **Ильиницкая, И. А.** Проблемные ситуации и пути их создания на уроке / И. А. Ильиницкая. – М., 1993. – 93 с.
3. **Кашлев, С. С.** Современные технологии педагогического процесса С. С. Кашлев. – Минск, 2000. – 169 с.
4. **Котов, В. В.** Организация на уроках коллективной деятельности учащихся / В. В. Котов. – Рязань, 1997. – 100с.
5. **Ксензова, Г. Ю.** Перспективные школьные технологии: Учебно-методическое пособие для преподавателей / Г. Ю. Ксензова. – М.: Пед. общество России, 2001. – 173 с.
6. **Лаптев, В. В.** Модернизация общего образования: технологии образовательной деятельности / В. В. Лаптев, А. П. Тряпицына. – СПб: Береста, 2002. – 95 с.
7. **Левитес, Д. Г.** Практика обучения: современные образовательные технологии / Д. Г. Левитес. – М.: Изд-во «Институт практической психологии»; Воронеж: НПО «Модэк», 1998. – 288 с.
8. **Ляудис, В. Я.** Инновационное обучение: стратегия и практика / В. Я. Ляудис. – М., 1994. – 202 с.
9. **Окунев, А.** Как учить не уча / А. Окунев. – СПб.: Питер, 1990.
10. **Пидкасистый, П. И.** Технология игры в образовании / П. И. Пидкасистый, Ж. С. Хайдаров. – Минск, 1996. – 110 с.
11. **Селевко, Г.К.** Альтернативные педагогические технологии / Г. К. Селевко. – М., 2005. – 132 с.Альтернат
12. **Шевченко, С. Д.** Школьный урок: как научить каждого / С. Д. Шевченко. – М., 1991.